Источник: “Звязда” – 2025-02-15

# Адчуваем сябе ў бяспецы

У сучасных умовах, калі грамадскія выклікі становяцца ўсё больш шматграннымі, важнасць ацэнкі бяспекі насельніцтвам набыла асаблівую актуальнасць. На прэс-канферэнцыі «Бяспека грамадства ў ацэнках насельніцтва: чаканні, прыярытэты, арыенціры» эксперты абмеркавалі сацыялагічныя дадзеныя па выніках апошняга даследавання, прысвечанага ацэнак насельніцтва па пытаннях бяспекі ў розных аспектах. Прыводзім галоўныя лічбы.

«Безумоўна, у сённяшні неспакойны час, з аднаго боку, геапалітычнай турбулентнасці, з другога боку, формаў камунікацыі, што ўскладняюцца, і развіцця лічбавізацыі — фактары бяспекі грамадства, бяспекі асобы набываюць першараднае значэнне, — расказаў намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Аляксандр Пасталоўскі. — Інстытут сацыялогіі вырашыў звярнуцца да гэтай праблематыкі і, адпаведна, з дапамогай вывучэння грамадскай думкі насельніцтва вывучыць асаблівасці ўспрымання бяспекі і тое, як адчувае сябе насельніцтва нашай краіны ў цяперашні час».

Паводле яго слоў, бяспека ў кантэксце сацыялогіі — гэта сацыяльнае самаадчуванне і самаадчуванне насельніцтва адносна абароненасці і парадку ў навакольнай рэчаіснасці. У рамках сацыялагічнага даследавання разглядаліся розныя тэматычныя блокі, сярод якіх бяспека атрымала важную ролю: «Даследаванне праводзілася з дапамогай методыкі тэлефоннага апытання, аб’ём выбарачнай сукупнасці склаў 900 рэспандэнтаў. Апытанне праводзілася ў сталіцы, абласных гарадах, малых і сярэдніх населеных пунктах, а таксама ў сельскай мясцовасці. Нам хацелася прааналізаваць тыя фактары, якія ў найбольшай ступені спрыяюць захаванню стабільнасці і спакою, якія могуць гуртаваць грамадства. Адно з пытанняў гучала так: „Якія ідэі, на вашу думку, сёння здольныя з’яднаць народ Беларусі?“. Абсалютная большасць рэспандэнтаў — каля 95% — адзначыла, што важным фактарам у падтрыманні бяспекі з’яўляецца захаванне стабільнасці і парадку ў грамадстве, арыентацыя на парадак. Гэта з’яўляецца той дамінуючай тэндэнцыяй, якая ў найбольшай ступені і ўспрымаецца абсалютнай большасцю насельніцтва».

Сацыёлагамі таксама быў праведзены параўнальны аналіз паказчыкаў дадзеных у 2024 годзе па даверы насельніцтва да праваахоўнай сістэмы. Як адзначыў спікер, тут назіраецца агульная тэндэнцыя — абсалютная большасць насельніцтва — больш за 70% — пазітыўна ацэньваюць і давяраюць органам Міністэрства ўнутраных спраў, пракуратуры, Камітэту Дзяржаўнай Бяспекі і гэтак далей: «У нашай краіне выбудаваная якасная сістэма праваахоўных органаў, якая непасрэдна забяспечвае стан стабільнасці, бяспекі і спакою ў грамадстве».

У ходзе сацыялагічнага даследавання закранулася і пытанне задаволенасці насельніцтва аховай грамадскага парадку ў населеных пунктах. «Каля 95-96% рэспандэнтаў задаволеныя ў поўнай меры работай праваахоўных органаў у іх населеных пунктах. Людзі цалкам адчуваюць сябе бяспечна, як у сваім доме, кватэры, так і на вуліцах свайго населенага пункта. Гэтыя тэндэнцыі, безумоўна, паказваюць эфектыўнасць той сістэмы, што забяспечвае стан спакою і правапарадку. З іншага боку, ацэнка рэспандэнтаў падкрэслівае правільнасць таго курсу, які забяспечвае стабільнае функцыянаванне соцыума», — падагульніў Аляксандр Пасталоўскі.

Данііл Хмяльніцкі. Адчуваем сябе ў бяспецы